Прысутнасць Другой сусветнай вайны ў сучаснай Беларусі і Германіі: мастацкія пазіцыі

Дыскусія
08.12.2026

18:00-19:30 (Берлін)
20:00-21:30 (Мінск)

Дыскусія адбудзецца на беларускай і англійскай мовах з сінхронным перакладам.

Злачынствы, здзейсненыя Германскім Рэйхам на акупаванай тэрыторыі Савецкага Саюза ў 1941–1944 гадах, пакінулі сляды, бачныя па сёння: месцы пахаванняў салдат і мірных ахвяр сталі часткай ландшафтаў. Пустыя месцы засталіся там, дзе да Халакосту ў гарадах і мястэчках існавалі яўрэйскія абшчыны, а замест сотняў вёсак, знішчаных разам з жыхарамі ў выніку нямецкай акупацыйнай палітыкі, засталіся пусткі. У Германіі дагэтуль засталіся не выяўленыя масавыя пахаванні яўрэйскіх прымусовых работнікаў і савецкіх ваеннапалонных.

Пасля заканчэння вайны ў абодвух грамадствах развіваліся розныя падыходы да пераадолення гвалту. Ключавым аспектам гэтых практык з'яўляецца суадносіны паміж памяццю і забыццём, якія ў Беларусі і Германіі фарміруюцца рознымі формамі дзяржаўнага кантролю і інтэрвенцыямі з боку грамадзянскай супольнасці: як месцы памяці, так і прабелы забыцця па-мастацку асэнсоўваюцца як дзяржаўнымі, так і незалежнымі актарамі.

У гэтай анлайн-дыскусіі мы ставім пытанне, як у 2026 годзе расійская вайна супраць Украіны, няспынныя масавыя рэпрэсіі ў Беларусі і правы паварот у Германіі змяняюць гэтыя канфігурацыі. Як мастачкі і мастакі працуюць з прабеламі ў памяці – асабліва там, дзе гістарычны досвед амаль адсутнічае ў публічнай свядомасці або паслядоўна сціраецца? Якія магчымасці мастацтва дае для перагляду ўсталяваных наратываў пра Другую сусветную вайну і раскрыцця альтэрнатыўных перспектыў? Якія канфлікты існуюць паміж дзяржаўным мемарыяльным мастацтвам і незалежнымі творчымі пазіцыямі?

Мадэрацыя

Фелікс Акерман, Форум Беларусь, Завочны ўніверсітэт у Хагене

Дыскусія

Вольга Бубіч, эсеістка, візуальная мастачка, лектарка, куратарка

Аксана Гайко, пісьменніца, драматургіня, тэатральная рэжысёрка, незалежная даследчыца

Уводзіны

Габрыэле Фрайтаг, Нямецкае таварыства па даследаванні Усходняй Еўропы

Для ўдзелу ў дыскусіі прайдзіце, калі ласка, рэгістрацыю па спасылцы: https://us02web.zoom.us/webinar/register/WN_EJiaO2V-QRWtg77N2XrQww